ДОБРЫ ВЕЧАР

Добрый вечер

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ ГАЗЕТА

1993 КАСТРЫЧНІК 28 ЧАЦВЕР

№ 205 (640)

Цана 20 рублёў

СТАЛІЧНАЯ ХРОНІКА

ПА ПАВЕДАМЛЕННЯХ КАРЭСПАНДЭНТАЎ «ДВ», АГЕНЦТВАЎ РІД, БЕЛАПАН, БЕЛІНФАРМ

ЦІ ДАСЯГНЕ ЗГОДЫ ЎЗГАДНЯЛЬНАЯ КАМІСІЯ?

27 кастрычніка ў другой палове дня ў Доме ўрада адбылося пасяджэнне трохбаковай узгадняльнай камісіі, у склад якой уваходзяць прадстаўнікі Савета Міністраў, Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі і аб'яднанняў наймальнікаў.

Па звестках БелаПАН, сярод праблем, якія абмяркоўваліся, такія, як пытанні падатковай палітыкі, суадносіны спажывецкага бюджэту да мінімальнай заработнай платы, заключэнне трохбаковага генеральнага пагаднення паміж ФПБ, урадам і аб'яднаннямі наймальнікаў на будучы год.

Ірына КАПУСЦІНА.

Готовьте колеса зимой, пока они есть

С «обувью» для авто, похоже, тоже будут сложности.

Связавшись с городом Бобруйском, корреспондент РИДа узнал, что местный шинный завод работает лишь эпизодически. Сказывается систематическое отсутствие сырья, в оплату за которое в Россию идет большая часть готовой продукции. Та же часть, которая остается в Беларуси, вероятно, вскоре станет многим недоступной. С 20 октября цены на многие виды шин подскочили в три и более раз.

Действуя по верной крестьянской смекалке, покупают шины пока колхозники. Дешевле не будет. А деньги за сельхозпродукцию необходимо куда-то срочно вложить. Как раз пора готовить к лету колеса.

Сергей ВЕРАС.

КОРАТКА

У магазін «Акадэмкніга» паступіў у продаж «Даведачны дапаможнік прадпрымальніка», створаны школай прадпрымальніцтва «Амалфея». Дапаможнік дае адказы на шырокае кола прававых пытанняў, якія ўзнікаюць у працэсе прадпрымальніцкай дзейнасці: парадак рэгістрацыі, адкрыццё рахунка ў банку, падаткаабкладанне, улік і прадстаўленне дэкларацый аб даходах, сацыяльнае страхаванне. Зрэшты, дапаможнік арыентаваны не толькі на бізнесменаў, але і на юрыстаў, работнікаў падатковых органаў, Фонду занятасці.

Юрый АЛЯКСЕЕЎ.

ПЛАКАЛІ ВАШЫ ГРОШЫКІ

Працягваецца планамерны перавод мінскіх аўтаматычных тэлефонных станцый на пахвілінную аплату мясцовых размоў. Пакуль гэта датычыць толькі прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый. З лістапада за кожную мінуту карыстання службовым тэлефонам у межах горада будуць плаціць уладальнікі нумароў, якія пачынаюцца з лічбы 71. Раней у спіс «пігмеяў цывілізацыі» апынуліся абаненты АТС нумароў 26, 27, 34, 36, 60, 61, 62, 65, 66.

Чакаецца, што працэдуры размовы з дамашніх тэлефонаў будуць «караціць» у другой палове будучага года. Таму ў тых, хто вельмі любіць пагаварыць, ёсць час падрыхтавацца да пахвіліннай аплаты за размову па тэлефоне.

Паводле папярэдніх разлікаў, за гэты ж тэрмін — да канца 1994 года — уладальнікі ўсіх службовых тэлефонаў павінны ўнесці штомінутную плату за мясцовыя размовы. Выключэнне робіцца толькі для адной пяціхвіліннай — роўна столькі можна пагаварыць у межах горада бясплатна. Пры гэтым за размову з усіх тэлефонаў будзе ўзімацца па тарыфе ... Напрыклад, размова з абаненцкай платы, якая, нягледзячы на грымасы інфляцыі, цяпер складае: 1800 рублёў за кожны тэлефонны нумар штомесячна для бюджэтных арганізацый, 4500 — для гаспадаразлікова.

Вераніка БЯГУН.

РЭХА ПАДЗЕІ

УОРЭН КРЫСТАФЕР У БЕЛАРУСІ

ПРАЛЁТАМ З УКРАІНЫ Ў ЛАТВІЮ

Як паведамлялася, 26 кастрычніка адбыўся візіт у Беларусь дзяржсакратара ЗША Уорэна Крыстафера, падчас якога ён сустрэўся з міністрам замежных спраў Беларусі Пятром Краўчанкам, Старшынёй Савета Міністраў Вячаславам Кебічам і Старшынёй Вярхоўнага Савета Станіславам Шушкевічам. Як паведаміў У.Крыстафер на прэс-канферэнцыі па выніках візіту, галоўнай мэтай яго паездкі па краінах СНД (акрамя Беларусі, ён ужо наведаў Казахстан, Расію і Украіну) з'яўляецца скарачэнне ядзернага арсенала гэтых дзяржаў і захоўванне ядзернай зброі. «ЗША цэняць гістарычную ролю крокаў, зробленых Беларуссю ў галіне скарачэння і знішчэння ядзернай зброі, што знаходзіцца на яе тэрыторыі», — сказаў У.Крыстафер. Дзяржсакратар ЗША паведаміў, што ён расказаў Станіславу Шушкевічу і Вячаславу Кебічу пра новую прапанову прэзідэнта ЗША Уільяма Клінтана ў галіне супрацоўніцтва

краін былога СССР з НАТА, якая атрымала назву «Партнёрства за мір». Гэта супрацоўніцтва, па словах Крыстафера, можа заключацца, у прыватнасці, у правядзенні сумесных вучэнняў Узброеных сіл Беларусі з краінамі НАТА і цэлым шэрагам іншых сумесных мерапрыемстваў. Беларусь таксама можа звяртацца да краін НАТА за кансультацыямі, калі палічыць, што яе суверэнітэт і незалежнасць знаходзяцца пад пагрозай. Як паведаміў на прэс-канферэнцыі кіраўнік парламента Беларусі Станіслаў Шушкевіч, беларускі бок выказаў гатоўнасць вывучыць дадзеную прапанову прэзідэнта ЗША. «Падчас размоў з прэм'ер-міністрам і старшынёй парламента, — адзначыў Уорэн Крыстафер, — я падкрэсліў важную ролю Беларусі ў развіцці беларуска-амерыканскіх эканамічных дачыненняў. Мы абмяркоўвалі пытанні па расшырэнню сувязяў беларускага і амерыканскага бізнесу, пашырэнню інвеставання ў эканоміку Беларусі, ход прыватызацыі ў гэтай краіне. ...Мы спадзяёмся да канца гэтага года падпісаць новы беларуска-амерыканскі дагавор аб абароне замежных інвестыцый». Уорэн Крыстафер падтрымаў ідэю правядзення датэрміновых выбараў у Вярхоўны Савет Беларусі вясной 1994 года, назваўшы гэта «дэмакратычнай тэндэнцыяй, якая вітаецца ЗША». «Мы гатовы аказаць тэхнічную дапамогу пры арганізацыі гэтых выбараў», — сказаў дзяржсакратар ЗША.

Віктар ДЗЯТЛІКОВІЧ, БелаПАН.

ПАКІНЬЦЕ ГЭТАЙ СЯМ'І ШАНЦ

У Святланы Гулевіч са Слоніма (на здымку Я.Пясецкага) траўма пазваночніка з паралічам ног. Хвароба прагрэсіруе, пазваночны дыск паступова ўваходзіць у спінны мозг. Тэрмінова патрэбна аперацыя за мяжой, якая каштуе каля 100 тысяч долараў. У Святланы двое дзяцей і муж. Гэтая дружная сям'я спадзяецца на вашу падтрымку і спагаду. У Слонімскім аддзяленні акцыянернага камерцыйнага «Прамбудбанка» адкрыты іх разліковы рахунак — № 701101, код 152101330 (добраахвотныя ахвяраванні арганізацый і грамадзян на лячэнне Гулевіч Святланы Іванаўны).

РІД.

НА СЕСІІ МІНГАРСАВЕТА

ПРЫВАТЫЗАЦЫІ ДАЛІ «ЗЯЛЕНАЕ СВЯТЛО»

Андрэй ПАТРЭБІН, Міхаіл ВАЛЬКОЎСКІ, «ДВ».

Учора пасяджэнне сесіі пачалося, як і звычайна, з разнага. Дэпутаты ўзнімалі пытанні, што хвалююць выбаршчыкаў, рабілі заявы. Старшыня камісіі па экалогіі М.Фрыдлянд папікаваўся будаўніцтвам у Мінску двух асфальта-бетонных заводаў без станоўчага заключэння экалагічнай экспертызы (якая, па яго словах, хутчэй за ўсё і не праводзілася). Дэпутат Г.Шумскі дадаткова растлумачыў парадак атрымання дазволу на газавую зброю, бо ў друку з'явілася супярэчлівая інфармацыя (у «Добрым вечары», дарэчы, аб гэтым напісалі правільна).

А далей — ясноўнае. Праграма прыватызацыі. Цяпер не прымалі па асобных пунктах, і ўсе яны атрымалі неабходную колькасць галасоў. Нарэшце, праграма была прынята, і цалкам, накат пад апладысменты дэпутатаў. Яна, як і спіс прыватызацыі аб'ектаў, з'явіцца ў друку.

Заява Мінгарсавета да Вярхоўнага Савета і Савета Міністраў Беларусі аб прыватызацыі выклікала шмат заўваг і на дапрацоўку з дапамогай камітэта эканомікі.

Не вельмі шмат часу заняло прыняцце рашэння аб забеспячэнні горада паліўна-энергетычнымі рэсурсамі і гарача-змазачнымі матэрыяламі на зімовы перыяд 1993-94 гадоў. Большасць складанасцей тут, як вядома, звязана з наступствамі расійска-беларускіх адносін і з магчымасцямі аплаты ў расійскіх рублях. Напрыклад, маюцца дагаворы на забеспячэнне Мінска тым жа мазутам. І ён будзе: толькі плаці. Мінгарсавет мае запэўненне Міністэрства энергетыкі: маўляў, усе неабходныя рэсурсы для сталіцы будуць. Здаецца, не ўсе дэпутаты ў гэта вераць: сярод папраўак да рашэння адзначым прапанову дэпутата Ю.Беленькага — звярнуцца да Вярхоўнага Савета, каб той адправіў у адстаўку ўрад «у сувязі з праваламі ў эканамічнай палітыцы». Такую палітычную прапанову, зразумела, не прынялі, але 72 дэпутаты за яе прагаласавалі.

Потым даволі хутка быў абмеркаваны і зацверджаны спіс аб'ектаў прыватызацыі на 1993-94 гады. Ён уключае каля 300 магазінаў, прадпрыемстваў, будынкаў. Тыя з іх, што выклікалі спрэчкі, былі прадбачліва адкладзены для дадатковага абмеркавання. Такім чынам, вялікая праца па падрыхтоўцы прыватызацыі камунальнай уласнасці скончылася. Што цяпер?

— Цяпер працэс прыватызацыі ў Мінску пойдзе як мае быць, ён набыў трывалую заканадаўчую базу і канкрэтны механізм ажыццяўлення, як зараз кажуць, атрымаў поўную легітымнасць, — коратка пракаментаваў падзею начальнік Мінскмаёмасці Т.К.Малінoўскі. — Спрэчных аб'ектаў у спісе не так многа. Гэта важна, бо ўжо сёння маецца шмат заявак на прыватызацыю. Значнае месца ў спісе займаюць магазіны і прадпрыемствы, працоўныя калектывы якіх хочуць выкупіць арандаваную ўласнасць альбо правесці акцыянаванне. Магчымы і іншыя варыянты, і калі на адзін аб'ект набярэцца некалькі заявак, размова ўжо будзе ісці аб конкурсе.

Застаецца нагадаць, што формы прыватызацыі ў Мінску будуць розныя: выкуп арандаванага, акцыянаванне, конкурсы-продажы, продаж з аўкцыёну.

Скажам прама: не вельмі радасна дэпутаты ўспрынялі прапанову Саўміна перадаць чатыры будынкі з камунальнай уласнасці ў рэспубліканскую для размяшчэння пасольстваў. Гэта дамы 4 і 24 на вул. Казлова, дом 5 на вул. Я.Купалы, дом 13а на вул. К.Маркса. Зараз там размешчаны гарадскія ўстановы — упраўленне землеўладкавання, Мінсксельгаспрад, упраўленне грамадскага харчавання, Ленінскі райхарчгандаль. На кампенсацыю, якую прапанавала Дзяржмаёмасць рэспублікі, гарадскія ўлады не згадзіліся. Мінгарвыканкам, дарэчы, не адмаўляецца ад даручэння ўрада шукаць магчымасці для размяшчэння пасольстваў. Сесія амаль аднадушна адмовілася перадаваць гэтыя будынкі.

Хутка і дружна было прынята рашэнне аб выкананні раней зацверджанага сесіяй «Часовага парадку пракату відэафільмаў». Намеснік старшыні Мінгарвыканкама А.Сасноўскі заявіў, што выканана ўся патрэбная работа па рэгістрацыі, выдачы ліцэнзій і г.д. Зараз падае папулярнасць відэасалонаў і расце попыт на пракат відэакасет. Таму пункты пракату атрымаюць у арэнду памяшканні ў бібліятэках. Рыхтуецца таксама прапанова да Вярхоўнага Савета, каб падаткаабкладанне ўлічвала ... падатку з відэапракату ў гарадскі бюджэт.

Потым дэпутаты вярнуліся да заканадаўчай ініцыятывы аб перадачы Мінгарсавету права распараджэння землямі прыгарадных тэрыторый. Дэпутат А.Мазго напомніў аб важнасці гэтага пытання для нармальнага развіцця горада. У мінулым годзе Прэзідыум Саўміна вярнуў яго на дапрацоўку. А цяпер прапанавана, каб Вярхоўны Савет даручыў Саўміну давесці справу да канца. «Добры вечар» неаднаразова расказваў, што гэта значыць для горада і гараджан. І дэпутаты за сваю заканадаўчую ініцыятыву дружна прагаласавалі. Напомнім, што гэта значна ўпарадкавала б выдзяленне зямлі пад будаўніцтва ў прыгараднай зоне, дапамагло б індывідуальнаму будаўніцтву.

Але і зараз Мінгарвыканкам знаходзіць кампрамісы з абласнымі і раённымі ўладамі. Намеснік старшыні Мінгарвыканкама У.Ярмошын паведаміў, што гораду ўдалося атрымаць зямлі для кампактнай забудовы: і для высотных дамоў, і для катэджаў. Гэта звыш 80 гектараў. Да таго ж гэта, а таксама вынікі інвентарызацыі зямлі ў горадзе, дазволяць мець у хуткім будучым да 2,5 тысяч участкаў пад індывідуальнае будаўніцтва (жадаючых пабудаваць свой дом зараз у Мінску каля 20 тысяч).

Пад канец удалося абмеркаваць некалькі пытанняў, якія датычацца зямельных адносін. Але як размеркаваць кампетэнцыю Мінгарсавета і яго органаў у прадастаўленні, адабранні зямлі і вырашэнні зямельных спрэчак — не вырашылі. Хаця хутчэй за ўсё гэтыя паўнамоцтвы будуць перададзены Мінгарвыканкаму (ён гэтым займаўся і раней).

Сесія працягне працаваць на наступным тыдні, 4 лістапада.

КАЛЯНДАР

Чацвер, 28 кастрычніка.

СОНЦА — 7.01/16.46.

Даўжыня дня — 9.45.

МЕСЯЦ — поўня 30 кастрычніка, захад 2.58/ўсход 14.20.

ІМЯНІНЫ

Сёння:

Праваслаўныя — Іван, Лук'ян, Яфіма.

Каталіцкія — Сымона і Юды Тадэвуша Апосталаў.

Заўтра:

Праваслаўныя — Лонгін.

Каталіцкія — Віялеты, Міхала, Нарцыса, Фэліцыяна.

КУРС ОБМЕНА наличной валюты в обменных пунктах коммерческих банков г.Минска на 28 ОКТЯБРЯ 1993 года

(на 9 час. 45 мин.)

Наименование банка	Доллар США			Немецкая марка			Российский рубль	
	Покупка		Продажа	Покупка		Продажа	Покупка	Продажа
	Наличный расчет	Чековая книжка		Наличный расчет	Чековая книжка			
Минское отделение АРКБ "Комплекс"	3550	3700 4000	3690	2160	2255 2435	2250	2.70	2.90
АКБ "Белбизнесбанк"	3550 3600	4070	3750 3800	2090 2120	2465	2230 2250	2.90	3.00
АКБ "Белвнешэкономбанк"	Сведения не предоставлены							
АКБ "Белпромстройбанк" (на 27 окт.)	3600	**	3800	2270	**	2370	2.70	3.00
АКБ "Беларусь"	3760	4080	4182	2288	2492	2570	3.30	4.10
АКБ "Дукат" (на 27 окт.)	3600	3960	3700	2150	2360	2250	2.70	3.00
АКБ "Поиск" (на 27 окт.)	3600	**	3700	2185	**	2255	2.60	**
АКБ "Приорбанк" (на 27 окт.)	3550	3905	3700	2165	2380	2260	**	**
КБ "Северо-запад"	3773	**	4100	2156	**	2450	2.60	**
Национальный банк РБ	4320.00			2563.04			4.10	

** -- не принимают

Информация подготовлена "Агентством Гревцова". Тел./факс (0172) 31-04-02

ОБРАЩЕНИЕ ИСПОЛКОМА МИНСКОГО ГОРОДСКОГО СОВЕТА НАРОДНЫХ ДЕПУТАТОВ К ЖИТЕЛЯМ МИНСКА

Уважаемые минчане!

Наступил отопительный сезон. Приближаются зимние холода. В связи с дефицитом топливно-энергетических ресурсов в Республике Беларусь предстоящая зима потребует от всех нас не на словах, а на деле экономно расходовать газ, электрическую и тепловую энергию. Уже сегодня для обеспечения бесперебойного снабжения жилья, детских садов, школ, больниц топливно-энергетическими ресурсами приходится ограничивать их потребление промышленными предприятиями, что сказывается на объемах выпуска продукции и, в конечном итоге, — на благосостоянии минчан.

Одним из главных условий экономии является утепление нашего жилья, поддержание в сохранности того, что уже сделано жилищными службами по подготовке жилого фонда к зиме. За 9 месяцев на эти цели из небогатого городского бюджета израсходовано более 4 миллиардов рублей, но приходится снова и снова стеклить окна, ремонтировать двери, восстанавливать разбитое и разломанное домовое оборудование. На это не хватит никаких средств.

Исполком Минского городского Совета народных депутатов обращается ко всем жителям г.Минска с просьбой более бережно относиться к жилому фонду, экономии энергоресурсов:

— не дайте руке современного варвара, будь то ребенок или взрослый, разбить, сломать окно на лестничной клетке, входные двери в подъезде, подвалы, на чердаки;

— поддерживайте порядок в местах общего пользования, не допускайте порчи домового оборудования;

— утеплите свои квартиры и примите меры по сохранению вашими домами тепла;

— своевременно выключите лампочку, электроприбор, газовую горелку, водопроводный кран.

Это будет существенной помощью минчан в обеспечении нормальной работы городского хозяйства в осенне-зимний период.

15 октября 1993 г.

З ЖЫЦЦЯ ГРОШАЙ

«ДОБРА» РАСІЙСКАМУ РУБЛЮ... ПАСТАВІЎ «ЗАЙЧЫК»

Па выніках чарговых таргоў на Міжбанкаўскай валютнай біржы Нацыянальны банк вызначыў афіцыйны курс беларускага рубля да валют іншых дзяржаў. Гэты курс дзейнічае з сённяшняга дня.

Валюта	адзіны курс з 28.10.93.	адзіны курс з 21.10.93.
1 долар ЗША	4320.00	4285.00
1 нямецкая марка	2563.04	2613.60
1 фунт стэрлінгаў	6406.57	6377.36
1 расійскі рубель	4.10	3.00
1 укр. карбованец	0.21	0.19
1 літоўскі літ	1057.80	1049.21

Назіраецца звыклае абясцэньванне «зайчыка». Гэта нікога ўжо не здзіўляе ды, бадай, і не вельмі засмучае — прывыклі. А вось расійскі рубель адносна нашага «пацяжэў» значна. Чым гэта выклікана? Прычын шмат, гаварылася пра іх неаднаразова. А апошнім часам з'явілася яшчэ адна: плануемае ў Беларусі новае павышэнне мінімальнага заработку. Прычым прапорцыя 3:4,1 = 15 000:20 000 даволі пераканаўча даказвае, што ад «пустых» грошай ніколі не багацелі. Наш урад «падкіне грошай» з першага лістапада, чарговы штуршок інфляцыі даў сёння, жыць жа па новых цэнах мы сталі ўчора.

Дзмітрый ГРЫВЕНСКІ.

ГРАФІК

ПРЫЁМУ ГРАМАДЗЯН СТАРШЫНЯМІ ПАСТАЯННЫХ ДЭПУТАЦКІХ КАМІСІЙ МІНСКАГА ГАРАДСКОГА САВЕТА НАРОДНЫХ ДЭПУТАТАЎ У ЛІСТАПАДЗЕ 1993 г.

Прыём адбываецца ў Мінгарсавеце па адрасу: пр-т Ф.Скарыны, 8, пакой № 108.

Прозвішча, імя, імя па бацьку старшыні камісіі	Назва камісіі	Дата	Час прыёму
КУЗЬМІЧ Вольга Аляксандраўна	па выхаванню і адукацыі	04.11.93	10.00-13.00
ЧАРНЯЎСКІ Ігар Мяфодзьевіч	па культуры і захаванню гісторыка-культурнай спадчыны	04.11.93	10.00-13.00
ЧЫЛЕК Тадэуш Аляксандравіч	па спажывецкаму рынку	05.11.93	10.00-13.00
МАРОЗАЎ Валянцін Іванавіч	па фізічнай культуры, масаваму спорту і турызму	08.11.93	10.00-13.00
ЯЦКЕВІЧ Валерый Мікалаевіч	па справах моладзі	08.11.93	15.00-18.00
АНДРЫЯНАВА Вера Дзмітрыеўна	па навуцы, навукова-тэхнічнаму прагрэсу і інфарматыцы	08.11.93	10.00-13.00
ХАРЛАП Андрэй Уладзіміравіч	па ахове правапарадку і пытаннях барацьбы са злачынствам	09.11.93	10.00-13.00
КАРАГІН Уладзімір Мікалаевіч	па эканамічнаму развіццю і бюджэту	09.11.93	15.00-18.00
ТАРЧЭЎСКІ Мікалай Мікалаевіч	мандатная камісія	10.11.93	10.00-13.00
КАЛЯДКА Аляксандр Васільевіч	па пытаннях работы Саветаў і развіццю самакіравання	10.11.93	10.00-13.00
МУХТАСАРАЎ Рым Рыгоравіч	па працы і сацыяльнай абароне насельніцтва	10.11.93	15.00-18.00
КОБАСА Міраслаў Уладзіміравіч	па льготах і прывілеях	15.11.93	15.00-18.00
ЛАПУНІН Альберт Паўлавіч	па энергетыцы, транспарту, дарожнай гаспадарцы і сувязі	16.11.93	15.00-18.00
ОБРАЗАЎ Міхаіл Яўгенавіч	па праблемах вынікаў катастрофы на ЧАЭС	17.11.93	15.00-18.00
ПЛІСКО Міхаіл Казіміравіч	па справах інвалідаў	24.11.93	15.00-18.00
КАВЫЗІН Уладзімір Іванавіч	па ахове здароўя	25.11.93	10.00-13.00
ФРЫДЛЯНД Міхаіл Яўсеевіч	па экалогіі	25.11.93	15.00-18.00
МАЗГО Алег Паўлавіч	па горадабудаўніцтву, дойлідству і будаўнічаму комплексу	29.11.93	10.00-13.00
БАГАМОЛЬСКІ Аляксей Ягоравіч	па жыллёвай палітыцы, камунальнай гаспадарцы і добраўпарадкаванню	29.11.93	15.00-18.00

ЗАЎВАГА:

1. У выпадку адсутнасці старшыні камісіі прыём вядзе яго намеснік.
2. Прыём вядзецца па праблемах, якія датычацца кампетэнцыі дадзенай камісіі.
3. Прыём вядзецца на аснове папярэдняга запісу. У спіс уключаюцца не больш за 20 чалавек.

Тэл.: 20-38-52, тэлефанаваць з 10.00 да 12.00 і з 15.00 да 17.00.

ПАСТАНОВА САВЕТА МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ № 724

Аб мерах па сацыяльнай абароне насельніцтва

У сувязі з павышэннем цэн на асобныя тавары і тарыфаў на паслугі Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Устанавіць з 1 лістапада 1993 г. мінімальную заработную плату ў памеры 20000 рублёў у месяц, а тарыфную стаўку першага разраду — 22000 рублёў.

2. Захаваць прадугледжаныя пунктам 2 Пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 22 ліпеня 1993 г. № 497 «Аб чарговых мерах па сацыяльнай абароне насельніцтва» (ЗП Рэспублікі Беларусь, 1993 г., № 21 арт. 412) для нізкааплачваемых работнікаў прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый, якія фінансуюцца з бюджэту, каэфіцыенты павышэння ставак заработнай платы і службовых акладаў, разлічаных у адпаведнасці з размеркаваннем іх па разрадах і каэфіцыентах адзінай тарыфнай сеткі. У памеры 1,2 — для тарыфікуемых з 1-га па 3-і разрад, у памеры 1,1 — для тарыфікуемых з 4-га па 7-ы разрад, устанавіўшы заработную плату работнікаў з тарыфным каэфіцыентам 1,0 у памеры 26400 рублёў у месяц (без уліку каэфіцыентаў за характар і ўмовы працы, якія зацвярджаюцца Дзяржаўным камітэтам па працы і сацыяльнай абароне насельніцтва).

3. Пры пераразліку пенсій з 1 лістапада 1993 г. і карэкціроўцы заработку пры назначэнні пенсій у адпаведнасці з палажэннем аб парадку пераразліку пенсій і карэкціроўцы заработку, які вызначаецца пры назначэнні пенсій, зацверджаным Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 7 кастрычніка 1992 г. № 606 (ЗП Рэспублікі Беларусь, 1992 г, № 28, арт. 523). Прымяняць замест сярэднямесячнай заработнай платы рабочых і служачых за II квартал 1993 г. сярэднюю заработную плату рабочых і служачых за верасень 1993 г.

4. Захаваць даплату да мінімальных памераў пенсій па ўзросту за выслугу гадоў, па інваліднасці, у выпадку страты карміцеля, у тым ліку да пенсій пры няпоўным стажы работы, што выплачваюцца органамі сацыяльнага забеспячэння, у памеры 40 працэнтаў мінімальнай пенсіі па ўзросту (незалежна ад надбавак да пенсій і іх павышэння, устаноўленых дзеючым заканадаўствам), прадугледжаную пунктам 5 Пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 22 ліпеня 1993 г. № 497 «Аб чарговых мерах па сацыяльнай абароне насельніцтва» (ЗП Рэспублікі Беларусь, 1993 г., № 21, арт. 412).

5. Міністэрствам і ведамствам, выканкамам мясцовых Саветаў народных дэпутатаў, кіраўнікам прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый, якія фінансуюцца з бюджэту, забяспечыць пераразлік ставак заработнай платы і акладаў работнікаў у адпаведнасці з устаноўленай гэтай пастановай стаўкай першага разраду і каэфіцыентамі адзінай тарыфнай сеткі.

6. Міністэрству сацыяльнага забеспячэння, Міністэрству абароны, Міністэрству ўнутраных спраў, Камітэту дзяржаўнай бяспекі і Галоўнаму ўпраўленню пагранічных войск пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь з 1 лістапада 1993 г. правесці пераразлік пенсій, зыходзячы з новага памеру мінімальнай заработнай платы.

Дзяржаўнаму камітэту па працы і сацыяльнай абароне насельніцтва сумесна з Міністэрствам фінансаў і фондам сацыяльнай абароны насельніцтва перагледзець памеры дапамог.

Кіраўнікам вышэйшых, сярэдніх і прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў перагледзець памеры дзяржаўных стыпендый у адпаведнасці з Пастановай Дзяржаўнага камітэта па працы і сацыяльнай абароне насельніцтва і Міністэрства фінансаў ад 24 мая 1993 г. № 42/420 «Аб памерах дзяржаўных стыпендый навучэнскай моладзі».

7. Павялічыць з 1 лістапада 1993 г. у 1,3 раза назначаныя да ўказанай даты дапамогі па беспрацоўю і стыпендыі грамадзянам, якія праходзяць прафесійную падрыхтоўку, павышаюць кваліфікацыю па накіраванню дзяржаўнай службы занятасці.

8. Дзяржкамстату забяспечыць разлік індэкса цэн, які характарызуе змяненне кошту спажывецкай карзіны ў адносінах да цэн лістапада 1993 г., і яго публікацыю ў перыядычным друку.

9. Прызнаць страціўшымі сілу пункты 1,7 Пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 24 верасня 1993 г. № 640 «Аб устанаўленні новага памеру мінімальнай заработнай платы і асобных сацыяльных выплат» (ЗП Рэспублікі Беларусь, 1993 г., № 26-27, арт. 526).

Старшыня Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь В.КЕБІЧ.

Кіраўнік спраў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь М.КАЎКО.

22 кастрычніка 1993 г. г.Мінск.

КОНВЕРСИЯ

ЕЩЕ ОДИН ШАГ

Сессия Мингорсовета утвердила решение о приеме НПО «Центр» из республиканской собственности в коммунальную. А значит, сделан еще один шаг к созданию в Минске с помощью иностранного капитала компактной индустриальной зоны — технопарка.

А началось все почти три года назад. Тогда, когда Беларусь объявила себя независимой и суверенной, американские бизнесмены заинтересовались минским научно-производственным объединением «Центр». И неспроста. Образованное чуть более десяти лет назад в интересах военно-промышленного комплекса СССР, объединение разрабатывает уникальные технологии. Центробежное оборудование, которое здесь создают, применяется широко — от строительства до космической техники. Минские центрифуги лучше западных: надежнее, долговечнее, экономичнее. Материалы, прошедшие через это оборудование, приобретают совершенно особенные свойства...

Словом, перспективные уникальные технологии НПО «Центр» принесут много пользы тем, кто умело ими распорядится. Предприятий с технологиями такого уровня у нас считанные единицы. И тем обиднее, что они сейчас на грани краха.

Дело в том, что «Центр» создает лишь опытные образцы этой техники. А серийно ее выпускать теперь, после распада СССР, некому. Выход из тупика возможен только при огромных капиталовложениях. Средств для этого у Беларуси сегодня нет. В этой ситуации привлечение иностранного капитала — единственное решение финансовой проблемы. Это еще и реальная перспектива приблизить не только технологию, но и опытные образцы, к мировому уровню. Как водится, нашим верховным властям понадобилось три года, чтобы оценить и понять выгодность и жизненную необходимость этого проекта. Три года ушло на «утрясание и пробивание». Три года доказывали: участники проекта собираются строить и развивать «Центр», с умом применить современную технологию, а не продавать ее за бесценок. Богатство, которым располагает «Центр», не востребовано и, похоже, здесь никому не было нужно. Как обычно, мы живем по-принципу: сам не «ам», и другому не дам. И только сравнительно недавно появились правительственное постановление и решение городских властей.

В итоге объединение перешло в коммунальную собственность, а Минский горисполком и американская фирма «Стэнфорд Интернэшнл Корп» создали совместное предприятие «Стэнфорд Техно-Центр РБ».

— В Беларуси подобный технопарк создается впервые, — говорит председатель комитета экономики Мингорисполкома П.Г.НИКИТЕНКО. — Это компактная индустриальная зона, где разместятся небольшие промышленные предприятия, выпускающие продукцию конкурентоспособную на мировом рынке. На них будут применяться самые современные технологии, в том числе и те, которыми располагает НПО «Центр». Там сосредоточатся наукоемкие производства и исследовательские центры, обладающие тем, что на Западе именуется «высокая технология». Технопарк разместится на территории вокруг НПО «Центр». Уже зарегистрировано акционерное общество закрытого типа, доля белорусской стороны в нем — 49 процентов. Оговорено, что в будущем мы выкупим у американцев контрольный пакет акций. Зарубежные партнеры обязуются вложить деньги в освоение передовой технологии, в производство, продажу и обслуживание уникальной техники, созданной в НПО «Центр». Если все пойдет нормально, ожидается приток инвестиций — десятки миллионов, а в перспективе — до миллиарда долларов. Технопарк даст нашему городу более 20 тысяч новых рабочих мест. Проект приобрел общенациональное значение. Он потребует новых методов управления, современных подходов к организации дела. Во многом именно успех или неуспех этого крупного замысла предопределит отношение действительно серьезных и действительно значительных зарубежных партнеров к Беларуси.

Понимают это, казалось бы, все. И поэтому странными и неоправданными выглядят сроки обсуждения и подготовки этого проекта.

Ситуация вокруг НПО «Центр», к сожалению, закономерна для сегодняшней Беларуси. После распада СССР такие предприятия выглядят как сияющие осколки некогда впечатляющего, но разбитого целого. А ведь они ценились как сокровище, были сокровенным достоянием сверхдержавы. Были? Скорее, есть и сегодня, но остаются невостребованными, ненужными, забытыми. А зря. На западный рынок нас даже с самым совершенным товаром просто так не пустят, предпочтут держать на нищенском пособии, подкармливать, но не выращивать конкурентов...

В случае с «Центром» американцы, естественно, не без выгоды для себя (иначе бы и не взялись), но все же помогут пройти «на тот берег». Не с водкой и сувенирами, не с дешевым сырьем, а с современной, наукоемкой продукцией.

Тем не менее, хотя постановления и соглашения о создании технопарка есть, все точки над «і» еще не расставлены. Реальных инвестиций еще нет, все в основном в стадии планов, подготовки, уточнений. Хотелось бы верить, что это — краткое затишье перед решительными действиями. Было бы несправедливо, если бы нужное для Беларуси и для Минска дело, которому три года отдавали свои силы немало людей и прежде всего руководители и специалисты НПО «Центр», вновь затормозилось.

Понятно, что проект очень серьезный. Понятно, что нужна ответственность, компетентность, осмотрительность. Но на примере долгих согласований вокруг «Центра» четко прослеживается и чувствуется общее недоверчивое отношение к рыночным нововведениям. Отношение это исподволь, но прочно укреплено и культивируется в коридорах власти, прикрытое словами о реформах, об «интересах республики». Отношение это умело прививается и внедряется в общественное сознание. Рецепт прост: и плохое, и хорошее смешивается в одном котле, щедро сдабривается рассуждениями о катастрофе и хаосе, пропитывается апокалиптическим настроением. «Вот до чего довели все эти реформы!..» Хотя реформ еще и не было, была лишь их имитация. Но атмосфера подозрительности и неуверенности уже создана. Те, кому полагалось бы действовать, не мигая смотрят друг на друга: как бы чего не случилось, как бы не сплоховать. И не действуют. Только кто-нибудь займется конкретным делом — сразу же сомнения, подозрения, взгляды со стороны. Так часто происходит в последнее время с многообещающими, на первый взгляд, планами, в том числе и с конкретными совместными проектами в экономике.

Однако у планов создания технопарка на западной окраине Минска есть все основания сбыться. Надо надеяться, что будущее у НПО «Центр» будет хорошее и что оно, это будущее, принесет немалую пользу нашему городу.

Ирина ГЕРМАНОВИЧ, «ДВ».

БЕЛАРУСІ — ЗДАРОВАЕ І АДУКАВАНАЕ ПАКАЛЕННЕ

Некалькі гадоў назад Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь была прынята нацыянальная праграма Беларусі «Ахова мацярынства і дзяцінства ва ўмовах уздзеяння вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС».

«Упершыню ў практыцы былога СССР на дзяржаўным узроўні ў рамках гэтай праграмы была пастаўлена задача сацыяльна-псіхалагічнай рэабілітацыі і сацыяльна-прававой абароны дзяцей і падлеткаў», — заявіў карэспандэнту БЕЛІНФАРМа намеснік дырэктара цэнтра псіхолага-педагагічных праблем Чарнобыля нацыянальнага інстытута адукацыі Генадзь Фралоў.

Сярод асноўных напрамкаў дзейнасці інстытута — распрацоўка навуковых рэкамендацый па арганізацыі навучальна-выхаваўчага працэсу такім чынам, каб дзеці атрымлівалі рэспубліканскі стандарт адукацыі пры захаванні псіхалагічнага і фізічнага здароўя. Як растлумачылі ў цэнтры, паводле даных шэрагу навуковых даследаванняў, толькі 12 працэнтаў беларускіх дзяцей можна лічыць абсалютна здаровымі (у зонах радыеактыўнага забруджвання — 4-9). 50-70 працэнтаў — маюць тыя або іншыя функцыянальныя адхіленні. Таму супрацоўнікі цэнтра псіхолага-педагагічных праблем Чарнобыля інтэнсіўна працуюць над стварэннем міжшкольных цэнтраў здароўя, у якіх плануецца з дапамогай лячэбна-фізічных метадаў, вітамінатэрапіі, фізкультуры папраўляць здароўе дзяцей і падлеткаў.

У Мінску, Мазыры, Астраўцы, Брагіне арганізаваны кабінеты і пункты псіхолага-педагагічнага кансультавання дзяцей і падлеткаў. Вядзецца работа ў рамках праграмы ЮНЕСКО-Чарнобыль.

Ларыса КЛЮЧНІКАВА.

ЗАЯВА

аб утварэнні аб'яднання дэмакратычных сіл «Вясна-94»

Палітычная, эканамічная і сацыяльная сітуацыя наблізілася да крытычнай рысы, крызіс штодзённа пагаршае жыццё людзей. Адказнасць за лёс роднай краіны патрабуе ад яе грамадзян сацыяльнай актыўнасці. Мы ўпэўнены, што ўмовы адраджэння Беларусі — народаўладдзе, рынкавая эканоміка і дзяржаўная самастойнасць. Але дасягнуць гэтага магчыма толькі агульнымі намаганнямі. Таму мы ўтвараем аб'яднанне дэмакратычных сіл, у склад якога могуць уваходзіць палітычныя партыі і рухі, грамадскія, прафесійныя і рэлігійныя арганізацыі, творчыя саюзы і прыватныя асобы.

Галоўная мэта аб'яднання — стварыць палітычныя ўмовы для цывілізаванага пераходу ад таталітарнай сістэмы да прававой дэмакратычнай дзяржавы.

Аб'яднанне грунтуецца на наступных прынцыпах:

— будаўніцтва суверэннай дзяржавы, бяз'ядзерны статус і неўваходжанне Беларусі ў ваенныя блокі;

— прыярытэт правоў грамадзян, замацаваных ва Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, перад інтарэсамі дзяржавы, нацыянальных і сацыяльных груп;

— рэфармаванне каманднай эканомікі ў сацыяльную рыначную.

Бліжэйшыя задачы аб'яднання:

— стварэнне кааліцыйнага ўрада народнага даверу дзеля ажыццяўлення рашучых эканамічных рэформ;

— правядзенне выбараў у Вярхоўны Савет не пазней вясны 1994 г. на падставе новага дэмакратычнага выбарчага закона.

Мы прыкладзём усе намаганні, каб спрыяць выхаду з крызісу шляхам рэформ і вырашэння рэальных эканамічных і сацыяльных праблем.

Мы выступаем не ад імя ўсяго народа, а за права народа вырашыць свой лёс на выбарчых участках.

Ад Аб'яднанай дэмакратычнай партыі Беларусі старшыня АДПБ **А.Дабравольскі**, ад Беларускай сацыял-дэмакратычнай Грамады старшыня ЦР БСДГ **А.Трусаў**, ад Беларускай сялянскай партыі старшыня БСП **Я.Лугін**, ад Рэспубліканскага прафсаюза «Канфедэрацыя працы Беларусі» в.а. старшыні ВК КПБ **А.Шакалаў**, ад Згуртавання прадпрымальнікаў Беларусі старшыня ЗПБ **М.Люцко**, ад Беларускай асацыяцыі ахвяраў палітычных рэпрэсій прэзідэнт БААПР **Г.Штыхаў**, ад Хрысціянскай злучнасці «Курапаты» намеснік старшыні ХЗК **М.Апейка**,

пісьменніца **С.Алексіевіч**, заслужаны дзеяч культуры Беларусі **Г.Асвяцінскі**, доктар сельскагаспадарчых навук член-карэспандэнт АН Беларусі **І.Нікітчанка**, доктар біялагічных навук **Ул.Доўнар**, доктар эканамічных навук **В.Яфрэменка**, кандыдат эканамічных навук **Ул.Гусакоў**, кандыдат эканамічных навук **М.Антоненка**, доктар сацыялагічных навук **А.Манаеў**, кандыдат эканамічных навук **Л.Гразнова**, член Канстытуцыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь кандыдат юрыдычных навук **М.Чудакоў**, доктар фізіка-матэматычных навук **М.Кавалёў**, доктар эканамічных навук **П.Гейзлер**, доктар эканамічных навук **Б.Жэліба**, кандыдат фізіка-матэматычных навук дэпутат Мінскага гарсавета **Г.Стэльмах**, намеснік старшыні Гомельскага гарсавета **В.Карнеенка**, дэпутат Барысаўскага гарсавета **С.Калеснік**, старшыня Саюза лібералаў «Маладая Беларусь» **А.Старавойтаў**, старшыня ІДХ «Ліпень» **В.Міхадзюк**, генеральны дырэктар АТ «Кросны» **Я.Грыб**, старшыня праўлення Беларускага саюза фермераў **К.Ярмоленка**, фермер **Б.Сальнікаў**, дэпутат Віцебскага абласнога Савета **Ю.Лаўрэнаў**, дэпутаты Віцебскага гарсавета: **Х.Жэлянаў, К.Галавіна, Н.Шур**, дэпутаты Першамайскага райсавета г.Віцебска: **М.Прышчэпаў, А.Мышлёнак, В.Півульская**, дэпутаты Мінскага гарсавета: **А.Драніцкі, Ул.Драніцкі, П.Стэцко, Я.Кушмар, А.Завадскі**, старшыня Беларускага камітэта «Дзеці Чарнобыля» **Т.Белавокая**.

Далучэнне да аб'яднання «Вясна-94» арганізацый і прыватных асоб працягваецца. Кантактны тэлефон каардынацыйнага камітэта «Вясны-94» 29-08-34, адрас: 220101, Мінск-101, а/с 329.

ЭНЕРГАЗБЕРАЖЭННЕ

ЦЕПЛАВАЯ РЭАБІЛІТАЦЫЯ ЖЫЛЛЯ — СПРАВА НОВАЯ, АЛЕ НЕАБХОДНАЯ

Сёння Рэспубліка Беларусь мае значны дамавы фонд. Толькі мураваных будынкаў налічваецца каля 150 тысяч. На патрэбы ацяплення прамысловых і жылых памяшканняў штогод расходуецца больш як 11 мільёнаў тон нафты. Аднак, на думку спецыялістаў, гэта лічба можа быць істотна зніжана. Якім чынам? На пытанне карэспандэнта БЕЛІНФАРМа адказвае дырэктар беларускага навукова-вытворчага інфармацыйнага цэнтра «Энергазберажэнне» Уладзімір Кузьміч.

— Паводле ацэнак беларускіх і зарубежных даследчыкаў, у нашых будынках з-за недастатковай цеплавой ізаляцыі, адсутнасці ўліку і рэгулявання цеплавой энергіі ўдзельны расход паліва на патрэбы цеплазабеспячэння ў 1,8 раза вышэйшы, чым у заходніх краінах. Толькі за кошт самых простых мерапрыемстваў, якія не патрабуюць высокіх тэхналогій і вялікіх капітальных укладанняў, можна знізіць выкарыстанне энергіі, напрыклад, у жыллёвым сектары, амаль у два разы. У рэальных лічбах эканомія складзе прыкладна адну тону ўмоўнага паліва на сярэднестатыстычную кватэру. Да такіх мер можна аднесці ўстаноўку калектыўнага цеплавога лічыльніка на дом або пад'езд, устаноўку індывідуальных лічыльнікаў газу, халоднай і гарачай вады ў кожнай кватэры, індывідуальнай цеплазберагаючай вентыляцыі. Перавага, напрыклад, такой вентыляцыі ў тым, што нават у халодную пару года памяшканні добра праветрываюцца, а цяпло выцяжнога паветра на 60 працэнтаў вяртаецца свежым. Такія мерапрыемствы з'яўляюцца бяспечнымі, надзейнымі і даўгавечнымі.

— Ці не з'явіцца ў цяперашняй цяжкай сітуацыі, звязанай з крызісам энергазабеспячэння, ажыццяўленне такой праграмы неапраўданай раскошай?

— Сапраўды, наша рэспубліка адчувае востры недахоп сродкаў для правядзення такой шырокамаштабнай работы. Улічваючы гэта, французская фірма «ВСЕОМ» прапанавала істотную фінансавую дапамогу. Гэтыя грошы прадугледжваецца выкарыстаць на вытворчасць спецыяльнага абсталявання, вымяральных устройстваў, набыццё неабходных тэхналогій і іх мантаж у кватэрах.

Увогуле плануецца правесці цеплавую рэабілітацыю каля 100 тысяч кватэр.

— Як мяркуецца разлічвацца за крэдыт?

— Тэрмін пагашэння пазыкі — 15 гадоў. Разлікі за крэдыт будуць праводзіцца за кошт зэканомленага паліва. Перыяд акупнасці праекта складзе пры найгоршых умовах чатыры гады. Калі ўлічыць, што энергазберагаючае абсталяванне надзейнае і даўгавечнае, то рэспубліка ад асваення гэтага праекта толькі выйграе.

Тэрэза ХАЮЦІНА, БЕЛІНФАРМ.

РЕСПУБЛИКА

Программа развала экономики

С заявлением о деятельности правительства и Верховного Совета республики выступили Гомельская городская организация ОДПБ.

Как передал корреспондент РИДа, в нем говорится, что грабительскими налогами, непродуманной таможенной и энергополитикой, отсутствием реальных реформ, правительство Кебича смогло лишь развалить экономику, поставив предприятия на грань банкротства и уготовив гражданам Беларуси участь безработных.

Высказываясь за добрососедские отношения с Россией и другими государствами СНГ, Гомельская организация ОДПБ выступает за восстановление экономических взаимовыгодных связей с ними, призывает к отставке нынешнего правительства, к перевыборам Верховного Совета и формированию эффективной рыночной и социально ориентированной экономики.

Коммунистов становится больше

Городская отчетно-выборная конференция ПКБ прошла в Могилеве.

По сведениям агентства РИД, в выступлениях лидеров местных коммунистов затрагивались вопросы работы городской организации: уплата взносов, деятельность «первичек». Обсуждалась возможность возрождения в городе и области ЛКСМ и политического клуба. Среди прочего отмечалось, что количество членов ПКБ в Могилеве увеличилось и составляет теперь около 500 человек.

А свобода убеждений?

В Могилеве прошло заседание координационного совета сил некоммунистической и антиимперской ориентации.

Как передал корреспондент РИДа, выступления и принятую на заседании «Ухвалу аб сацыяльна-эканамічным становішчы ў вобласці» пронизывала одна мысль:«Забараніць!». Высказывалась она в связи с деятельностью компартии и созвучных с ней партий и движений.

По сообщениям РИД.

ВАНДАЛЫ КОНЦА XX ВЕКА

Анатолий БЕЛОУС, «ДВ», фото Ю. ЗАХАРОВА.

Какое издание сегодня ни откроешь — везде одно и то же: топливный кризис, проблемы с горючим. Сутками маются в очередях автолюбители, все больше хозяйственников заглядывается на гужевой транспорт. Иные предприятия уже наладили производство специальной утвари, допотопных подвод. И, знаете, спрос на эту архаику с каждым днем возрастает. А между тем, сокращается количество пригородных рейсов, дорожают билеты, сельчане все больше полагаются на свои ноги. И во всем этом хаосе осталась одна спасительная отдушина — электротранспорт. Он-то и принял на себя основной удар по перераспределению пассажиропотоков. Нагрузка на него, в частности, на пригородные поезда-электрички, сегодня просто чудовищная. Невзирая на регулярное подорожание, по-прежнему до смешного низкими остаются здесь тарифы, чисто символическими штрафы. Поезда эти, как водится, не опаздывают, рейсы отменяются крайне редко. Чем же платит наш пассажир за это очевидное удобство и преимущество? А рассчитываемся мы кощунством, вандализмом...

ЧТО ИМЕЕМ — НЕ ХРАНИМ

Вот свежий факт. В прошедшее воскресенье ближе к полуночи в электропоезде, следовавшем в Молодечно, совершен поджог. Если бы не расторопность машинистов и помощь пассажиров, сгорел бы полностью вагон. На это ему требуется всего 10 минут. Ущерб составил около 3 миллионов рублей. Но один вагон — ничто, железнодорожники считают их по парам, электросекциями. То есть, пару вагонов из послужного списка уже можно вычеркнуть. В составе осталось только 8 вагонов. И нагрузка на них еще более возрастет. Той же ночью еще на одном электропоезде, но следовавшем уже из Молодечно, была совершена попытка поджога...

— В этом году это уже пятая электросекция, выведенная из строя, — сокрушается заместитель начальника Минского отделения БЖД Е.И.КОРОБКОВ. — А практически, мы уже недосчитались целого состава — причины все те же — вандализм на поездах. В свое время при разделе железнодорожного имущества былого Союза нам повезло. Минское отделение в ту пору являлось эдаким экспериментально-испытательным полигоном Рижского вагоностроительного завода. К нам отошло несколько десятков новеньких, с иголочки, современных комфортабельных электропоездов. Сегодня им цены нет. А точнее, прибалты требуют за каждый новый 1 миллион долларов. В перерасчете на «зайчики» — более 4 миллиардов рублей. Конечно, такое удовольствие нам не по карману. Вся надежда — на сохранение старого, между тем, еще сравнительно современного парка. И вот, как видите, что имеем — не храним... И как за всем уследить, если работников транспортной милиции раз, два — и обчелся. У них уже от совершенных правонарушений голова кругом идет, а тут еще и сопровождение. Всего же по четырем направлениям ежедневно работает 182 пары электропоездов. Трудимся в режиме «зима-лето», как можем, подстраиваемся под пассажиров, особенно в летние дни. И вот такая благодарность... Направление на Молодечно многие машинисты просто проклинают. По выходным дням здесь, в Уше, Олехновичах и Радошковичах, проходят дискотеки. Молодежь, разогревшись, сначала работает ногами. Затем разъезжаются, и кое у кого чешутся руки. Что поделаешь, видимо, придется отменять ночные рейсы. В Таллинне так уже и поступили. От них одни убытки. И еще какие!

ЭТО ЖЕ САМОУБИЙСТВО!

Хозяйство Н.И.ГРИГОРЕНКО, начальника моторовагонного депо «Минск», мы объезжали на машине. Оно попросту необъятно. Более 50 составов прописано на здешних путях. Но один, а это, повторяю, 10 вагонов, смело можно сдавать на металлолом. Мы подошли к одной электросекции. Забраться вовнутрь не рискнули. Даже снаружи по обгорелым останкам было видно, что все в салоне покорежено, хаотично перевернуто вверх дном, словно по нему прошлись кумулятивным снарядом. Все это — результат пожара, и никакое восстановление здесь не поможет. Вот так повеселилась наша молодежь... С конца состава мы забрались в ту самую электричку, пострадавшую в воскресенье, и пошли по вагонам. «Художества» нашего подрастающего поколения встречались на каждом шагу, не считая именных «автографов» с напутствиями друзьям и близким в тамбурах и на спинках сидений. Но если бы только эта шантрапа тяготела к «эпистолярному» жанру. В одном из салонов было вспорото несколько сидений и вырван поролон. В другом — они попросту порезаны. Еще вагон — разбито стекло. Практически каждое второе сиденье во всем поезде штопано-перештопано. Мало того — многие из них различных цветов. До однотипности ли уж тут? Окурки, семечки, клочки бумаги уже в расчет не берутся. А вот и сгоревший вагон. Думаю, снимок этого кошмара будет более красноречив...

— Такие акты вандализма в этом году особенно участились, — рассказывает Николай Иванович. — Этот случай уже шестой. Ущерба только по нашему отделению — на 300 миллионов рублей. Но ситуация усугубляется еще проблемой, где достать материалы, на что купить. Вся оснастка вагонов — в Прибалтике, и только за валюту, кабель — в России. А с теми и другими как рассчитываться, где набраться валюты? И, представьте себе, расход материалов для ремонта идет сегодня на сотни и тысячи погонных метров. Особенно дерматина. Что ни месяц — вынь да положь километр-другой. А сколько нужно на восстановление иных материалов! Ломают пластик, гнут и воруют багажные полки, раскурочивают алюминиевую оснастку, бьют стекла, вырывают и жгут поролон. Добрались даже до замков с ручками, им, похоже, нашли применение на дачах. Это же безумие какое-то, настоящий беспредел. А случись пожар в вагоне на ходу, он же под напряжением 25 тысяч вольт! Или вот, разбили в одной из электричек стекла в машинном отделении. Пришлось фанерой заделывать. А как же обзор и видимость для машиниста? С этим же напрямую связаны безопасность движения и жизнь пассажиров. Это же самоубийство какое-то...

ИСКЛЮЧЕНИЕ ИЛИ НОРМА?

